# ГІСТОРЫЯ І БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

**І. В. Грабянчук**

## МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БАБРУЙСКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА (1949–1954)

Стварэнне новай ВНУ заўсёды з’яўляецца складанай задачай, паспяховае выкананне якой забяспечвае арганічнае адзінства трох важнейшых састаўных частак: матэрыяльна-тэхнічнай базы, навучальнага працэсу, навукова-даследчай работы. Аналіз праблемы забеспячэння матэрыяльна-тэхнічнай базы вывучаемай навучальнай установы дасць магчымасць выявіць некаторыя важнейшыя фактары, якія вызначылі яе нядоўгае існаванне.

Бабруйскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут быў створаны на базе Бабруйскага педагагічнага вучылішча 1 верасня 1949 г. і размяшчаўся ў будынку былой жаночай Аляксееўскай гімназіі, пабудаваным яшчэ ў другой палове XIX ст. (вул. Сацыялістычная, 119). У гэтым навучальным корпусе мелася 24 пакоі: зала на 75 чалавек, 2 аўдыторыі на 50 чалавек, 3 – на 40 чалавек, 5 – на 25 чалавек, з якіх адна была занята пад бібліятэку і дзве пад кабінеты. Астатнія 13 пакояў былі невялікімі па сваёй плошчы, у якіх размяшчаліся адміністрацыя, канцылярыя, бухгалтэрыя, партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі, складское памяшканне. Інстытут меў два грузавыя аўтамабілі, якія забяспечвалі яго гаспадарчыя патрэбы.

12 верасня 1949 г. прыступілі да заняткаў 196 студэнтаў. Ад Бабруйскага педагагічнага вучылішча інстытуту перайшоў інтэрнат (вул. Пушкіна, 122), разлічаны на 90 чалавек. Аднак перад пачаткам 1949/50 навучальнага года там абвалілася столь, у выніку чаго ў памяшканні інтэрната змаглі пражываць толькі 60 чалавек. Студэнцкая сталовая не была арганізавана з-за адсутнасці неабходнай плошчы, і студэнтам даводзілася харчавацца ў сталовых гархарчгандлю. Ужо па выніках першага навучальнага года стала зразумела: каб стварыць нармальныя ўмовы для навучальнага працэсу, патрэбны дадаткова 6 аўдыторый па 50 чалавек кожная і інтэрнат на 100–120 чалавек.

Інтэрнат быў адрамантаваны перад пачаткам 1949/50 навучальнага года. У ім жылі да 100 студэнтаў. Яны маглі карыстацца працоўным пакоем для самападрыхтоўкі, у якой мелася чытальная зала і перасоўная бібліятэка. Аднак, як паказала праверка інтэрната, у ім было золка і холадна, і ў цэлым побыт студэнтаў заставаўся неўладкаваным. Варта таксама адзначыць, што пытанне аб выніках комплекснай праверкі побытавых умоў студэнтаў было абмеркавана на паседжанні Рады інстытута толькі 17 студзеня 1953 г., г.зн. толькі праз тры з паловай гады ад пачатку дзейнасці гэтай навучальнай установы.

Для паўнаты агульнай карціны матэрыяльнага забеспячэння варта адзначыць, што ў інстытуце не было сваёй спартзалы, таму ў непагадзь заняткі па фізічнай культуры праводзіліся ў калідоры навучальнага корпуса, «што

вельмі нязручна і адмоўна ўплывае не толькі на фізічнае выхаванне, але і на іншыя прадметы, паколькі шум у калідоры падчас фізкультурных заняткаў замінае працы ў аўдыторыях і кабінетах».

Кіраўніцтва інстытута імкнулася забяспечыць усім неабходным абсталяваннем навучальныя кабінеты і лабараторыі. На працягу 1949/50 навучальнага года было набыта прыбораў і наглядных дапаможнікаў на суму 9 959 рублёў, што дазволіла дастаткова добра забяспечыць навучальны працэс. У той жа час існавала практыка самазабеспячэння навучальных кабінетаў неабходным абсталяваннем. Напрыклад, выкладчыкі і студэнты ўласнымі сіламі вырабілі серыю прыбораў па радыётэхніцы і наглядных дапаможнікаў для практычных заняткаў на ўроках фізікі ў школе: прыбор для дэманстрацыі правіла паралелаграма сіл, прыбор для дэманстрацыі пераўтварэння патэнцыйнай энергіі ў кінетычную і інш. Вядома, неабходныя заяўкі на матэрыяльнае забеспячэнне навучальных кабінетаў падаваліся ў Мінск, Маскву, Ленінград, але паступленне неабходнага абсталявання ішло вельмі дрэнна.

Сур’ёзныя праблемы былі звязаны з камплектаваннем і эфектыўнасцю працы бібліятэкі інстытута. У пратаколе пасяджэння Рады инстытута № 2 ад 23 лістапада 1949 г. была зафіксавана такая яе агульная ацэнка: «Прымушае жадаць лепшага бібліятэка, паколькі гэта ў асноўным бібліятэка сярэдняй школы». Найбольшыя складанасці пачыналіся падчас экзаменацыйных сесій, бо не хапала студэнтам патрэбнай літаратуры, а выкладчыкі казалі, што на перыяд экзаменаў чытальная зала бібліятэкі павінна працаваць да… 10–11 гадзін вечара. З другога боку, змест пратаколаў Рады Бабруйскага настаўніцкага інстытута паказвае, што яна не ўдзяляла сістэматычнай ўвагі працы бібліятэкі і за 5 гадоў заслухала справаздачу яе загадчыка толькі на адным пасяджэнні, якое адбылося 22 снежня 1951 г. У пастанове па гэтаму пытанню была запісана прапанова для паляпшэння працы бібліятэкі завесці картатэку. Паказальна, што на гэта звярнулі ўвагу толькі на трэцім годзе дзейнасці інстытута.

Калі пытанні матэрыяльнага забеспячэння БНІ ў цэлым былі вырашаны, то з забяспечэннем прыезжых выкладчыкаў жылой плошчай з самага пачатку яго працы пачаліся вялікія праблемы. У верасні 1949 г. на старонках «Савецкай Радзімы» прагучала крытычная заўвага на адрас гарадскіх улад: «Няхай будзе сказана ў папрок кіраўнікам Бабруйскага гарвыканкама, якія вынеслі рашэнне забяспечыць кватэрамі выкладчыкаў у Доме спецыялістаў, (Дом Камуны), але рашэнне не выканалі. Кватэрнае пытанне і да гэтага часу не вырашана і гэта мела ўплыў на першы навучальны дзень (3 вучэбных аўдыторыі заняты пад кватэры для выкладчыкаў)».

Дырэкцыя і партыйная арганізацыя інстытута не аднойчы ставілі пытанне перад партыйнымі і савецкімі арганізацыямі горада аб забеспячэнні кватэрамі выкладчыкаў. У сакавіку 1950 г. бюро абласнога камітэта КП(б)Б прыняло пастанову, якая абавязвала старшыню Бабруйскага гарвыканкама неадкладна вырашыць гэту праблему, але да канца 1949/50 навучальнага года «кватэрнае пытанне» засталося не вырашаным.

Сітуацыя не змянілася да лепшага і ў наступныя гады. У справаздачы Бабруйскага настаўніцкага інстытута за 1950/51 навучальны год паведамлялася, што «на працягу навучальнага года 4 працаўнікі інстытута пражывалі на прыватных кватэрах, якія зусім не забяспечваюць нармальныя ўмовы для навуковай працы». Зразумела, што такія побытавыя ўмовы зніжалі эфектыўнасць працы выкладчыкаў. Акрамя таго, адсутнасць жылля не давала магчымасці Бабруйскаму настаўніцкаму інстытуту ў бліжэйшай перспектыве запрасіць на працу высокакваліфікаваных супрацоўнікаў і аб’явіць конкурс на замяшчэнне вакантных пасад.

Сумная карціна незайздроснага матэрыльнага становішча бабруйскіх выкладчыкаў паўстае з справаздачы інстытута за 1951/52 навучальны год: 4 супрацоўнікі па-ранейшаму пражываюць на прыватных кватэрах у тых жа умовах, па-ранейшаму няма магчымасці аб’явіць конкурс на замяшчэнне вакантных пасад. Адсутнасць якой-небудзь надзеі праглядаецца ў наступных радках узгаданага дакумента: «У вырашэнні гэтых пытанняў неабходна дзейсная дапамога з боку Міністэрства асветы БССР, абласных партыйных і савецкіх арганізацый. Да гэтага часу гэтай патрэбнай дапамогі інстытут не меў». У Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт з просьбай аб вырашэнні жыллёвай праблемы для выкладчыкаў БНІ звяртаўся Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафесійнага саюза работнікаў вышэйшай школы і навуковых устаноў, але безвынікова. Не меў поспеху і зварот па гэтым пытанні Міністэрства асветы БССР да старшыні Бабруйскага абласнога выканаўчага камітэта Ждановіча А. Ф.

Такім чынам, Бабруйскі настаўніцкі інстытут меў сур’ёзныя праблемы з матэрыяльным забеспячэннем сваёй дзейнасці, якія так і не знайшлі свайго належнага вырашэння. Ці мог быць іншым лёс першай вышэйшай навучальнай установы ў Бабруйску? Верагоднасць альтэрнатывы закрыццю тэарэтычна існавала. Далейшае развіццё інстытута патрабавала значнага пашырэння плошчаў кабінетаў, лабараторый, бібліятэкі. Акрамя таго, неабходна было пабудаваць новы вучэбны корпус і жылы дом для выкладчыкаў на 24 кватэры. Аднак на працягу ўсіх гадоў свайго існавання ў вырашэнні гэтых пытанняў ніякай дапамогі з боку гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх партыйных і савецкіх органаў Бабруйскі настаўніцкі інстытут не дачакаўся. У пачатку ж 1954 г. яго дырэктар накіраваў у Міністэрства асветы ліст з прапановай пераўтварыць гэту навучальную ўстанову ў педагагічны інстытут з 4-х гадовым тэрмінам навучання, а неабходныя для яго будынкі перадаць з ліку тых, што належалі структурам ліквідаванай Бабруйскай вобласці, але гэта ідэя была адхілена.

Стаць педагагічным інстытутам Бабруйскі настаўніцкі інстытут рэальнай магчымасці не меў. Нават калі б і былі вырашаны пытанні з матэрыяльнай базай, не вырашанай засталася б галоўная праблема – недахоп высокакваліфікаваных выкладчыкаў для ВНУ больш высокага ўзроўню. Гэты інстытут быў запатрабаваны да жыцця ў найбольш складаны перыяд развіцця адукацыі ў Беларусі, калі ў школах рэспублікі вельмі не

хапала кваліфікаваных настаўнікаў. Ён дастаткова поўна выканаў сваю задачу, выпусціўшы з сваіх сцен 815 настаўнікаў, і мусіў адысці ў гісторыю, а частка яго выкладчыкаў працягнула сваю педагагічную дзейнасць у іншых ВНУ краіны, у тым ліку і ў Мінскім інстытуце замежных моў.